ступа: http://www.runivers.ru/bookreader/book9567/#page/347/mode/1up. – Дата доступа: 30.11.2016.

37. Gudele // Słownik geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajów słowiańskich / wydany pod redakcyą F. Sulimierskiego, Br. Chlebowskiego, Wł. Walewskiego. T. 2. – Warszawa: nakł. F. Sulimierskiego i Wł. Walewskiego, 1881. – S. 903.

38. *Jel., Al.* Pleszczenice / Al. Jel. // Słownik geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajów słowiańskich / wydany pod redakcyą F. Sulimierskiego, Br. Chlebowskiego, Wł. Walewskiego. T. 8. – Warszawa: nakł. F. Sulimierskiego i Wł. Walewskiego, 1887. – S. 251.

39. *Сыракомля, У.* Выбраныя творы / Уладзіслаў Сыракомля; [укладанне, прадмова, каментар К. Цвіркі]. – Мінск: Беларуская навука, 2011. – 580 с., [4] л. іл.

40. *Jel., Al.* Pierszaje / Al. Jel. // Słownik geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajów słowiańskich / wydany pod redakcyą F. Sulimierskiego, Br. Chlebowskiego, Wł. Walewskiego. T. 8. – Warszawa: nakł. F. Sulimierskiego i Wł. Walewskiego, 1887. – S. 99–100.

41. *Бажэнаў, Ю. В.* Забалаць / Ю. Бажэнаў, В. Шаблюк // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / Беларус. энцыкл.; рэдкал.: Г. П. Пашкоў (галоўны рэд.) і інш.; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск: БелЭн, 1996. – Т. 3. Гімназіі – Кадэнцыя. – С. 390.

42. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Фонд 299. – Воп. 5. – Спр. 75.

43. НГАБ. – Фонд 299. – Воп. 5. – Спр. 73.

44. Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы (ДГЛА). – Фонд 716.– Воп. 1. – Спр.49.

45. НГАБ. – Фонд 146. – Воп. 2. – Спр. 249.

**(Дата падачы: 20.02.2017 г.)**

*Ю. М. Кежа*
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, Полацк

*J. Kezha*
Polotsk State University, Polotsk

**УДК 94(476)**

# УЛАДА КНЯЗЯ І БАЯРСТВА Ў ПОЛАЦКАЙ ЗЯМЛІ Ў ПАЧАТКУ XI СТ.

# POWER OF THE PRINCE AND ELITE OF POLOTSK LAND IN XI CENTURIES

*У артыкуле аналізуецца роля і месца прадстаўнікоў полацкіх грамадскіх эліт (баярства) у перыяд станаўлення дынастыі Рагвалодавічаў (пачатак XI ст.). Разглядаюцца ўзаемаадносіны княжацкай улады і мясцовай арыстакратыі ў працэсе хрысціянізацыі Полацкай зямлі.*

*Ключавыя словы: княжацкая ўлада; баярства; Рагвалодавічы; хрысціянізацыя.*

*In an article analiziruestsya role and place of the representatives of the Polotsk social elites (nobility) in the making Rogvolodovichey dynasty (beginning of the XI century.). It considers the relationship of princely power and the local aristocracy and the process of Christianization of Polotsk.*

*Key words: princely power; The boyars; Rogvolodovichi; Christianization.*

Баярства як адна з вышэйшых сацыяльных груп сфарміравалася на тэрыторыі Усходняй Еўропы ў перыяд IX–X стст. [1, с. 85–86]. Аб складзе,

паходжанні, матэрыяльным забеспячэнні, а таксама аб узаемаадносінах баярства з князем адзінай думкі сярод гісторыкаў няма.

У гістарыяграфіі XIX ст. была высунута думка аб дваякім паходжанні ўсходнеславянскай знаці – з «службовага» баярства, якое непасрэдна звязана з княжацкай уладай, і аўтахтоннага («мясцовага», «племяннога») грамадства [2, с. 163]. Савецкая гістарыяграфія асноўныя прычыны вылучэння і магутнасці баярства бачыла ў вотчынным землеўладанні, зараджэнне якога адносілася да IX–X стст. [3]. Пры гэтым асабліва падкрэсліваліся дэцэнтралізатарскія памкненні баярства ў XII–XIII стст. [4, с. 98–100]. У сучаснай гістарыяграфіі В. Л. Янін і П. П. Талочка падкрэсліваюць сувязь баярства з гарадскімі абшчынамі, асабліва інтэнсіўна з XII–XIII стст. [5, с. 20; 6, с. 115]. У сваю чаргу І. Я. Фраянаў бачыць у баярах «абшчынных» лідараў на ўсім працягу гісторыі раннесярэднявечнай Русі [7, с. 217]. А. А. Горскі і М. Б. Свярдлоў разглядаюць баярства як галоўныя элементы дзяржаўна-службовай арганізацыі [8, с. 95; 9, с. 428]. У апошнім даследаванні П. С. Стэфановіча, прысвечаным ваенна-палітычнай эліце Русі X–XI стст., аўтарам прапанавана канцэпцыя, згодна з якой баярства як сацыяльную катэгорыю можна ўмоўна падзяляць на «радавую» і «службовую», але варта разумець, што абодва фактары дзейнічалі адначасова, і ўзаемадзеянне гэтых двух відаў знаці ніколі не ператваралася ў поўнае падпарадкаванне аднаго іншым [1, с. 536].

У свой час Г. Лаўмяньскі справядліва казаў аб самастойнасці ўсходнеславянскага баярства і выключаў яе адназначна службовую ролю. Як піша даследчык: «Знаць служыла князю, але па сутнасці дзейнічала ў прыватных інтарэсах» [4, с. 99]. З гісторыкам варта пагадзіцца ў характарыстыцы ўзаемаадносін баяр з князем як у першую чаргу «дамоўных», чым выключна «дружынных» або «абшчынных» [1, с. 539].

Раннесярэднявечныя ўтварэнні Усходняй Еўропы, заснаваныя на мясцовай аснове і прадстаўленыя арыстакратыяй, арыентуюцца не на поўнае падпарадкаванне ўладара, а на супрацоўніцтва з ім і на яго падтрымку [10, с. 183]. Сэнс палітычнай узаемасувязі князя і баярства ў дадзеным выпадку палягаў у тым, што мясцовая палітычная эліта імкнулася каардынаваць розныя інтарэсы і памкненні і пры гэтым мінімізаваць верагоднасць канфлікту з княжацкай уладай [1, с. 537].

Знаць удзельнічала ў судзе і кіраванні, якія выстройваліся па ўладнай вертыкалі. Не выклікае сумненняў, што вяршыняй дадзенай вертыкалі была асоба князя. Сацыяльная роля і статус князя ў гэтым сэнсе ў залежнасці ад палітычных абставін і гістарычных традыцый таго ці іншага рэгіёна мог насіць як фармальна-сімвалічны, так і рэальны характар. Пры гэтым адносіны паміж рознымі інстытутамі ўлады не разумеліся як абсалютныя.

Пра значную ролю баярскага савета, які вырашаў агульнадзяржаўныя пытанні разам з князем, гаворыць паведамленне «Аповесці аб мінулых часах» 6495 (987) г. У дадзеным артыкуле распавядаецца аб «выбары веры»

князем Уладзімірам Святаславічам. Уласна сам летапісны артыкул пачынаецца з апісання савета Уладзіміра з баярамі і «старцамі градскімі»: «Созва Володимеръ бояры своя и старци градские и рече им…». Князь паведамляе савету аб прыходзе паслоў-місіянераў з прапановай прыняць новую веру і пытаецца ў баяр: «Да что ума предасте и что отвещаете?» [11, с. 75]. Баяры і старцы раяць князю абраць «мужоў» і адправіць іх да балгараў, немцаў і грэкаў для іспыту набажэнстваў: «И реша бояре и старци веси…» [11, с. 76]. Пасля таго, як князь накіроўвае паслоў у розныя краіны і калі тыя вяртаюцца ў Кіеў, ён зноў раіцца з баярскім саветам: «И созва князь бояры своя, и старца и рече Володимеръ: се придоша мужи, послани нами, да слышимъ от них бывшее» [11, с. 76].

Як адзначаюць даследчыкі, аповед аб «выбары веры» не з'яўляецца ўстаўкай і належыць да старажытных пластоў летапісу [12, с. 245–255]. З тэксту высвятляецца, што баяры і вышэйшыя прадстаўнікі мясцовай арыстакратыі («старцы градскія») як прывілеяваная сацыяльная група грамадства, прымалі нароўні з князем важнейшыя палітычныя рашэнні, ад якіх залежаў лёс дзяржавы.

Якія менавіта людзі або групы людзей разумеліся пад тэрмінамі «баяры» і «старцы градскія», варта разглядаць у залежнасці ад кантэксту ўзгадкі [1, с. 216]. Верагодна, што ў адных выпадках мелася на ўвазе племянная або мясцовая знаць дадзяржаўнага паходжання, на што ўказваў А. Н. Насонаў [13, с. 24–25]. У іншых выпадках пад выразам «старцы градскія» разглядалася гандлёва-рамесная вярхушка гарадоў X–XI стст. [14, с. 16–31]. Як справядліва заўважыў П. С. Стэфановіч, размова вядзецца аб людзях павышанага сацыяльнага статусу, палажэнне якіх фарміравалася не шляхам дэлегавання вышэйшых паўнамоцтваў ад князя, а ўкаранення прывілеяванага статуса ў агульнаграмадскай свядомасці [1, с. 216]. «Старцы градскія» і, верагодна, «баяры», якія ўзгадваюцца ў паведамленні, не звязаны з князем і прадстаўляюць асобную палітычную сілу, якая можа ўплываць на княжацкія рашэнні.

Такім чынам, у перыяд фарміравання раннесярэднявечных дзяржаў на землях Усходняй Еўропы важным фактарам узмацнення княжацкай улады і ролі князя ў грамадскім кіраванні з'яўляецца падтрымка князя грамадскімі элітамі [7, с. 514]. У дадзены перыяд (канец X – пачатак XI ст.) князі не маглі не арыентавацца ў сваіх дзеяннях на ажыццяўленне патрэбаў і чаканняў гэтай групы насельніцтва [15, с. 266]. На думку В. І. Сяргеевіча, насельніцтва разумее сваю няздольнасць уладкавацца без княжацкай улады і разам з тым разумее неабходнасць даць яму высокае месца ў сваім асяроддзі, без чаго было б немагчыма дасягнуць мэт грамадскага міру і стабільнага развіцця краіны [16, с. 173].

Пра падтрымку мясцовымі палітычнымі элітамі пэўнага княжацкага роду сведчыць замацаванне асобнай дынастыі Рагвалодавічаў у Полацку (пачатак XI ст.) [17, с. 92–100]. Спакойнае княжэнне маладога князя Бра-

чыслава Ізяславіча было абумоўлена значнай роляй, якую адыгрывала мясцовая знаць, бо, улічваючы малалетні ўзрост Брачыслава, прыкладна да пачатку 1020-х гг. рэальная ўлада ў княстве не магла належаць толькі аднаму князю. Пры гэтым варта адзначыць верагодныя супярэчнасці паміж полацкімі сацыяльнымі вярхамі і папярэднікам Брачыслава – Ізяславам Уладзіміравічам.

Ізяслаў, пасаджаны Уладзімірам у Ізяслаўлі ў выніку адміністрацыйнай рэформы 988 г., з'яўляўся фактычна намеснікам кіеўскага князя і праваднiком яго палітыкі [17, с. 92–100]. Галоўны сэнс рэформы палягаў у замене племянных князёў сынамі Уладзіміра ў падуладных гарадах і, такім чынам, замене мясцовай улады прадстаўнікамі роду Рурыкавічаў. На думку Э. М. Загарульскага, наданне Полацка Ізяславу Уладзіміравічу было абумоўлена стратэгічным значэннем, якое мела Полаччына: праз Полацкую зямлю па Дзвіне праходзіў адзін з галоўных гандлёвых шляхоў «з вараг у грэкі» [18, с. 92].

Пры гэтым варта таксама ўлічваць гіпотэзу В. М. Ляўко, што спачатку для кіравання Полацкім княствам Ізяслаў быў накіраваны намеснікам не ў Полацк, а ў Ізяслаўль, які знаходзіўся на мяжы з кіеўскімі ўладаннямі. Гэта павінна было адасобіць Ізяслава ад полацкай племянной знаці. Але паколькі Ізяслаў быў унукам Рагвалода па мацярынскай лініі, полацкае баярства заключыла з Ізяславам дагавор, па якому Ізяслаў станавіўся князем полацкім [19, с. 45].

Нягледзячы на ініцыятыву полацкага баярства ва ўкняжэнні Ізяслава, полацкі князь у сваёй палітыцы абапіраецца на ўзоры, якія выкарыстоўвае яго бацька. З імем Ізяслава ўсходнеславянская летапісная традыцыя звязвае распаўсюджванне хрысціянства ў Полацкай зямлі [20, с. 68]. Старэйшым полацкім храмам была царква святой Багародзіцы, якая ўзгадваецца ў Цвярскім летапісе пад 1001 г., а ў «Аповесці аб мінулых часах» – пад 1007 г. [21, с. 118]. Можна меркаваць, што Багародзіцкая царква ў Полацку была пабудавана па ўзоры Багародзіцкай (Дзесяціннай) царквы ў Кіеве [22, с. 39]. Паводле даследчыка гісторыі рускай царквы Я. Е. Галубінскага, у 992 г. была ўтворана Полацкая епархія [23, с. 335]. Згодна з дадзенымі фактамі, можна казаць аб спробах актыўнага распаўсюджвання хрысціянства на тэрыторыі Полацкай зямлі менавіта Ізяславам як намеснікам Уладзіміра ў ажыццяўленні апошнім палітыкі дзяржаўнай цэнтралізацыі ўсходнеславянскіх зямель.

У адрозненне ад політэістычнага язычніцтва, хрысціянская вера ў адзінага Бога адпавядала адзінаўладдзю князя ў дзяржаве, г. зн. духоўна асвячала гэтую ўладу [23, с. 552–554]. У якасці матэрыяльнай падтрымкі духавенства князь вылучаў са сваіх даходаў дзясятую частку на ўтрыманне царкоўнай арганізацыі [11, с. 69].

Дахрысціянскія сацыяльныя нормы і каштоўнасці падтрымлівалі грамадскі аўтарытэт мясцовых эліт. У сваю чаргу хрысціянская рэлігія

ўзвялічвала грамадскае палажэнне князя і сакралізавала яго ўладу. У выніку новая рэлігія павінна было пазбавіць уладных правоў і прывілеяў мясцовую арыстакратыю, грамадская моц якой падтрымлівалася дахрысціянскай сістэмай каштоўнасцей. Верагодна, дадзеныя абставіны прывялі да пазбаўлення Ізяслава ўлады і яго ранняй смерці ў 1001 г.

Пра канфлікты паміж уладаром і мясцовым набілітэтам на глебе прыняцця і распаўсюджвання хрысціянства сведчаць скандынаўскія матэрыялы. Паводле звестак «Кола зямнога», калі ўладар не падтрымліваў старыя парадкі, асвячоныя дахрысціянскай традыцыяй, або пад выглядам распаўсюджвання хрысціянства ламаў ранейшую сістэму сацыяльных адносін, ён сустракаў вострае супраціўленне мясцовай знаці (або знатных бондаў). Справа магла дайсці да дэлегітымізацыі конунга [24]. Уладар (конунг, князь) мог перамагчы ў працэсе хрысціянізацыі. У нарвежскай, дацкай і рускай гісторыі прыкладамі з'яўляюцца Олаф Харальдсан (пэўных поспехаў у справе насаджэння хрысціянства дасягнуў яго папярэднік Олаф Тругвасан), Харальд сын Грома, Уладзімір Святаславіч. Уладар мог пайсці на кампраміс і, з'яўляючыся хрысціянінам, захоўваць дахрысціянскія рэлігійныя нормы, як нарвежскі конунгі Хакан Добры, Свейн і Эрык Хаканарсаны. Верагодна, пры выкананні палітыкі бацькі Ізяслава Уладзіміра ў распаўсюджванні хрысціянства полацкі князь сустрэў моцны супраціў мясцовага набілітэту і не змог перамагчы ў гэтай барацьбе.

Пра вялікую ролю ў палітычным жыцці Полацкай зямлі прадстаўнікоў мясцовага баярства ў першай палове XI ст. сведчаць паведамленні ісландскай «Пасмы аб Эймундзе Хрынгсане», якая датуецца XIII ст. [25, с. 134–135]. Паводле звестак «Пасмы», перад тым як заключыць дамову з варажскімі наймітамі, полацкі князь Брачыслаў адказаў варажскаму правадыру Эймунду: «Дайце мне час параіцца са сваімі мужамі, бо яны даюць мне грошы, але выплочваю іх я. Эймунд конунг пагаджаецца на гэта. Вартылаў конунг збірае цінг са сваімі мужамі…» [26]. Дадзеныя паведамленні далі падставу Г. В. Штыхаву весці размову аб існаванні баярскага савета ў Полацку [27, с. 15]. У сваю чаргу І. Я. Фраянаў і А. Ю. Дварнічэнка прапанавалі разглядаць гэтыя звесткі як існаванне веча ў Полацкай зямлі XI ст. [28, с. 254]. На нашу думку, варта пагадзіцца з высновай Г. В. Штыхава.

Пра ўплывовае значэнне прадстаўнікоў мясцовай знаці (баярства) у Полацку ў X–XI стст. гаворыць факт укняжэння Рагвалода на землях Полацкага Падзвіння ў сярэдзіне X ст., які не мог адбыцца без пагаднення паміж мясцовымі элітамі і прышлай нарманскай уладай. Таксама сведчаннем пагаднення паміж полацкім баярствам і Ізяславам ў канцы X ст. з'яўляецца захаванне за Ізяславам Полацка пасля смерці старэйшага сына Уладзіміра Вышаслава, што, па сутнасці, супярэчыла прынцыпам «леcтвічнай сістэмы» [11, с. 85].

Традыцыя палітычнага дуалізма, калі дзейнасць князя абмяжоўвалася ўплывам прадстаўнікоў мясцовага грамадства, была характэрна для Полат-

чыны амаль на ўсім працягу раннесярэднявечнай гісторыі. У сваю чаргу палітычная актыўнасць веча як агульнага народнага сходу, які вырашаў значныя грамадскія пытанні ў Полацкай зямлі XI ст., не пацвярджаецца летапіснымі крыніцамі. Актыўная дзейнасць вечавых сходаў у Полацку, паводле крыніц, назіраецца толькі з 20-х гг. XII ст. Высновы аб полацкім вечы XI ст., якія былі зроблены І. Я. Фраянавым і А. Ю. Дварнічэнка на падставе адзінкавай узгадкі сагі – крыніцы, для якога была характэрна неразвітасць і недакладнасць сацыяльнай тэрміналогіі, а таксама перанос на ўсходнеславянскую глебу скандынаўскіх грамадскіх інстытутаў, не выглядае пераканаўчым [29, с. 144–146]. Такім чынам, можна зрабіць выснову, што ў Полацкай зямлі да XII ст. веча як палітычны інстытут, прадстаўлены шырокімі коламі грамадства, яшчэ не сфарміраваўся, і дзейнасць полацкага князя кантралявалася прадстаўнікамі баярскай арыстакратыі.

Такім чынам, пры асэнсаванні асаблівасцей станаўлення полацкай княжацкай дынастыі Рагвалодавічаў і характары ўлады полацкіх князёў канца X – пачатку XI ст. трэба ўлічваць значнае становішча і аўтарытэт мясцовых палітычных эліт. Полацкаму баярству належыць значная роля ва ўкняжэнні ў Полацку Ізяслава Уладзіміравіча. Палітыка Ізяслава, накіраваная на падпарадкаванне ўладзе Кіева, прывяла да пазбаўлення яго ўлады і наступнае выключэнне з родавага кола Рагвалодавічаў. У пачатку XI ст. полацкім князем становіцца Брачыслаў Ізяславіч. Пры Брачыславе дзейнічаў баярскі савет, які кантраляваў дзейнасць полацкага князя на карысць інтарэсаў мясцовага грамадства. Актыўнасцю полацкіх эліт тлумачыцца замацаванне за Рагвалодавічамі права на ўладу ў Полацкай зямлі.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Стефанович, П. С.* Бояре, отроки, дружины: военно-политическая элита Руси в X–XI вв. / П. С. Стефанович. – М.: Индрик, 2012. – 656 с.
2. *Пресняков, А. Е.* Княжое право в Древней Руси / А. Е. Пресняков. – М.: Наука, 1993. – 634 с.
3. *Юшков, С. В.* Очерки истории феодализма в Киевской Руси / С. В. Юшков. – М.; Л., 1939. – 537 с.
4. *Ловмяньски, Х.* О происхождении русского боярства / Х. Ловмяньски // Восточная Европа в Древности и Средневековье. – М., 1978. – С. 93–100.
5. *Янин, В. Л.* У истоков Новгородской государственности / В. Л. Янин // Столичные и периферийные города Руси и России в средние века и раннее новое время (XI–XVIII в.) / редкол.: В. Л. Янин (отв. ред). – М.: Древохранилище, 2003. – С. 15–27.
6. *Толочко, П. П.* Власть в Древней Руси X–XIII века / П. П. Толочко. – СПб.: Алетейя, 2011. – 200 с.
7. *Фроянов, И. Я.* Киевская Русь. Очерки социально-политической истории / И. Я. Фроянов. – Л.: Изд-во Ленинград. ун-та, 1980. – 243 с.
8. *Горский, А. А.* Древнерусская дружина / А. А. Горский. – М.: Изд-во Прометей, 1989. – 122 с.
9. *Свердлов, М. Б.* Домонгольская Русь: князь и княжеская власть на Руси VI – первой трети XIII в. / М. Б. Свердлов. – СПб.: Акад. проект, 2003. – 736 с.

10. *Reuter, T.* The Medieval Nobility in Twentieth-Century Historiography / T. Reuter // Companion to Historiography, ed. by M. Bentley. – L.; N. Y., 1997. – С. 177– 02.

11. Полное собрание русских летописей: Т. 1 Лаврентьевская летопись. – Ленинград: Изд-во Акад. наук СССР, 1926–1928. – 379 с.

12. *Милютенко, Н. И.* Святой равноапостольный князь Владимир и Крещение Руси. Древнейшие письменные источники / Н. И. Милютенко. – СПб., 2008. – 420 с.

13. *Насонов, А. И.* История русского летописания XI – начала XVIII века. Очерки и исследования / А. И. Насонов. – М., 1969. – 376 с.

14. *Ключевский, В. О.* История России. Специальные курсы / В. О. Ключевский. – М.: ООО «Издательство Астрель»: ООО «Издательство АСТ», 2003. – 479 с.

15. *Ловмяньски, Х.* Русь и норманны: пер. с пол. / Х. Ловмяньский; общ. ред.: В. Т. Пашуто [и др.]. – М.: Прогресс, 1985. – 304 с.

16. *Сергеевич, В. И.* Лекции и исследования по древней истории русского права / В. И. Сергеевич. – 2-е изд., доп. – СПб.: Типография М. М. Стасюкевича, 1899. – VI. – 480 с.

17. *Кежа, Ю. М.* Да пытання аб станаўленні ўлады Рагвалодавічаў у Полацку / Ю. М. Кежа // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў: зб. навук. арт. II міжнар. навук. канф., Полацк, 17–18 красав. 2014 г.: у 2 ч. / Полацкі дзярж. ун-т; пад агул. рэд. Д. У. Дука, У. А. Лобача, С. А. Шыдлоўскага. – Наваполацк: ПДУ, 2014. – Ч. 2. – С. 92–100.

18. *Загорульский, Э. М.* Белая Русь с середины I тысячелетия до середины XIII века / Э. М. Загорульский; вступ. ст. В. А. Тепловой. – 2-е изд., доп. – Минск: Изд-во «Четыре четверти», 2014. – 532 с.

19. *Левко, О. Н.* Расселение славянских племенных союзов на территории Беларуси (кривичи-полочане) / О. Н. Левко // Беларусь: народ, государство, время. – Минск: Белорус. навука, 2009. – С. 34–35.

20. Полное собрание русских летописей. Т. 13. Летописный сборник, именуемый Патриаршей или Никоновской летописью. – СПб.: Тип. И. Н. Скороходова, 1904. – 308 с.

21. *Приселков, М. Д.* Троицкая летопись. Реконструкция текста / М. Д. Пріселков. – М.: Изд-во АН СССР, 1950. – 518 с.

22. *Дук, Д. У.* Гісторыя Полацка: па матэрыялах археалагічных даследаванняў: вучэб.-метад. комплекс для студ. спец. 1-21 03 01-01 01, 1-02 01 02-04 / Д. У. Дук. – Наваполацк: ПДУ, 2006. – 112 с.

23. *Голубинский, Е.* История русской церкви. Т. 1. Период первый, киевский или домонгольский / Е. Голубинский. – 2-е изд., испр. и доп. – М.: Университетская типография, 1901. – 968 с.

24. Круг земной. Сага об Инглингах [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://norse.ulver.com/src/konung/heimskringla/ynglinga/ru.html. – Дата доступа: 13.06.2014 г.

25. Древняя Русь в свете зарубежных источников: хрестоматия / под ред. Т. Н. Джаксон, И. Г. Коноваловой, А. В. Подосинова. Т. V: Древнескандинавские источники. – М.: Русский Фонд Содействия Образованию и Науке, 2010. – 512 с.

26. Прядь об Эймунде Хрингссоне [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://norse.ulver.com/src/konung/eymund/ru2.html. – Дата доступа: 08.01. 2015 г.

27. *Штыхов, Г. В.* Древний Полоцк (IX–XIII вв). / Г. В. Штыхов. – Минск: Наука и техника, 1975. – 136 с.

28. *Фроянов, И. Я.* Города-государства Древней Руси. / И. Я. Фроянов, А. Ю. Дворниченко. – Л.: Изд-во Ленингр. ун-та, 1988. – 269 с.

29. *Мельникова, Е. А.* Ингигерд и Ярослав Мудрый: источниковедческие наблюдения / Е. А. Мельникова, Э. Хрингссон // Анфологион. Славяне и их соседи. Власть, общество, культура в славянском мире в Средние века. К 70-летию Бориса Николаевича Флори. Выпуск 12. – М.: Изд-во «Индрик», 2008. – С. 144–160.

**(Дата падачы: 01.02.2017 г.)**